# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА А. А. САКАЛОВАЙ

**Перыяд дзеяння:**

снежань 1941 г. – кастрычнік 1943 г.

**Месца дзеяння:**

Пескавацік, Кастрычніцкі раён г. Віцебска

**Колькасць:**

12 чалавек

**Кіраўнікі:**

Алена Сакалова («Цёця Лена», «Пявуння»)

Дзейнічала са снежня 1941 г. да кастрычніка 1943 г. Аб’ядноўвала 12 чалавек. Кіраўнік А. А. Сакалова («Цёця Лена», «Пявуння»). У групу ўваходзілі яе муж А. А. Сакалоў, сястра Н. А. Пашкевіч-Уданоўская, Г. С. Яраноўская, а таксама Л. М. Гнядоўская, М. І. Іваноў, А. Ц. Капцель, І. Ц. Кузьмянкоў, М. Р. Лазарэўскі, бацька і дачка А. К. і М. А. Левановічы, Я. Матылёў.

Барацьбу з ворагам група вяла сумесна з іншымі падпольнымі групамі, трымала сувязь з Віцебскім падпольным гаркамам КП(б)Б, партызанскімі брыгадамі 1-ай Беларускай і «Аляксея» (А. Ф. Данукалава), з аператыўна-чэкісцкай групай А. П. Максіменкі. На сваёй кватэры (вул. 2-я Заводская, 12) Сакаловы прымалі сувязных, партызан, армейскіх разведчыкаў, ваеннапалонных для адпраўкі да партызан, сюды ж сцякалася інфармацыя. Бацька і дачка Левановічы вялі разведку, хадзілі на сувязь, выводзілі з горада ваеннапалонных. 19 студзеня 1943 г. яны былі схоплены і расстраляны.

У верасні 1943 г. Яўген Матылёў вывеў са строю воданапорную вежу на аэрадроме. Пашкевіч-Уданоўская рыхтавала ваеннапалонных, якія працавалі на цагельным заводзе, да адпраўкі ў партызаны. Яраноўская, работніца сталовай цагельнага завода, забяспечвала падпольшчыкаў і партызан харчаваннем.

У канцы верасня 1943 г. на кватэры Сакаловых правялі вобыск. Арыштаваная Яраноўская была закатавана, Сакалоў адпраўлены ў лагер смерці. Дзяржаўныя ўзнагароды атрымалі 5 чалавек, у тым ліку кіраўнік групы.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група А. А. Сакаловай / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 495.

2. **Подпольная** группа Соколовой Е. А. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 296.